# «БЕЗ РАЗВІЦЦЯ ВЁСКІ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адраджэнне вёскі было вельмі вялікай праблемай, але, нягледзячы на ўсе цяжкасці, буйныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі, на якіх грунтаваліся сельгасарганізацыі, на шматкі рэзаць не сталі. «І паглядзіце на гэтую праблему з сённяшняй вышыні — мы не на шматкі дзелім, мы больш за ўсё імкнёмся да аб'яднання гаспадарак», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прыняцце праграмы адраджэння вёскі заклала базу для развіцця сельскай гаспадаркі. Асабліва гэта бачна на прыкладзе Шклоўскага і Аршанскага раёнаў, сельскагаспадарчай базе якіх могуць пазайздросціць іншыя раёны. «Мы зрабілі, можа, першы крок, можа, некалькі буйных крокаў, але мы адвялі народ ад бездані. Мы яго накармілі, апранулі і гэтак далей. Ці можна супакоіцца? Не», — адзначыў Прэзідэнт. Таму сёння, па яго словах, важна акрэсліць далейшыя шляхі па развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці.

Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чаму ён так шмат увагі ўдзяляе сельскай гаспадарцы: «Некаторыя гэта тлумачаць тым, што Лукашэнка — аграрнік, таму ён больш займаецца сельскай гаспадаркай. Ніякі я не аграрнік. У мяне глыбінных ведаў у сельскай гаспадарцы відавочна недастаткова, каб мяне звалі аграрнікам. Але душа ў мяне сялянская. Я разумею, што гэта галоўнае. Без развіцця вёскі краіны не будзе. Ні нашай, ні Расіі, ні Украіны. Мы славяне, людзі калектыўныя па сваім духу, па менталітэце. Таму сяло — гэта аснова».

Кіраўнік дзяржавы назваў прычыны, па якіх сёння неабходна і далей развіваць сельскую гаспадарку. Першая — без сельскай гаспадаркі краіны няма. Другая — попыт на прадукты харчавання пастаянна ўзрастае і будзе расці, таму што ў свеце павялічваецца насельніцтва. І тут, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, Беларусі важна не адстаць. Трэцяя — сельская гаспадарка дае добрае развіццё, валавы ўнутраны прадукт атрымлівае добры працэнт ад харчавання. Чацвёртая — імідж краіны. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што адзін чалавек у сельскай гаспадарцы забяспечвае работу ад 1 да 7 чалавек у горадзе. «Назавіце яшчэ адну такую галіну, якая так забяспечвае працай людзей», — задаў рытарычнае пытанне ён.

«Можна шмат назваць прычын, якія штурхаюць нас да развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці. Але немалаважна тое, што мы ўмеем гэта рабіць. У нас створана добрая школа, у нас ёсць база. Мы, дзякуй Богу, не разбурылі той падмурак, які быў створаны ў савецкія часы для развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці, які ў тым ліку цягне вялікі кавалак прамысловасці. Сельгасмашынабудаванне займае, напэўна, палову нашай прамысловасці. Гэта вялікая справа. Я яшчэ раз паўтараю, можна шмат назваць прычын, каб абгрунтаваць далейшыя захады па развіцці вёскі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

### «Я ведаю тут кожнае поле»

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму фокус увагі накіраваны менавіта на Шклоўскі і Аршанскі раёны. Паводле яго слоў, яго родны Шклоўскі раён быў своеасаблівым плацдармам для рэалізацыі праграмы адраджэння вёскі: «Я ведаю тут кожнае поле. Я ведаю тут добра сельскую гаспадарку». На нараду быў запрошаны і Аляксандр Папкоў, які ў свой час распрацоўваў і ўвасабляў праграму адраджэння вёскі ў жыццё. Ён працаваў у Шклоўскім раёне і дасканала ведае сітуацыю ў сельскай гаспадарцы. Паводле слоў Прэзідэнта, тут пачыналі ўвасабляць праграму будаўніцтва малочнатаварных комплексаў. І ўсё гэта распаўсюдзілася на ўсю краіну. Зразумела, у кожнага раёна свая спецыфіка. Але былі створаны гаспадаркі-маякі, якія падавалі прыклад астатнім. У тым ліку і ў Шклоўскім раёне, напрыклад, ААТ «Александрыйскае».

Прэзідэнт заўважыў, што суседні Аршанскі раён у Віцебскай вобласці ён лічыць самым перспектыўным. Там добрая база, шырокі спектр вытворчасці сельгаспрадукцыі — і племянны статак, і свінагадоўля, і жывёлагадоўля. «Таму недапушчальна, як ён развіваўся апошнія некалькі гадоў і развіваецца зараз», — катэгарычна выказаўся беларускі лідар.

У гэтым і мэта нарады — зрабіць некалькі крокаў па мадэрнізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і вёскі ў цэлым. Але, як падкрэсліў Прэзідэнт, гэта не тая сітуацыя, дзе трэба дэманстраваць узоры і мадэлі, па якіх пойдуць іншыя. Ён звярнуў увагу, што ў кожнага рэгіёна свае асаблівасці сельскагаспадарчай дзейнасці, аднак, напрыклад, можна пераймаць досвед арганізацыі сельгаспрадпрыемстваў. Таму, зрабіў акцэнт кіраўнік дзяржавы, прымаючы рашэнні на нарадзе ў Шклове, нельга разбурыць тое, што створана і добра працуе ў іншых рэгіёнах. Галоўная задача для галіны — навесці парадак, каб атрымаць найбольш эфект ад капітальных укладанняў і дысцыпліны тэхналагічнай і выканальніцкай.

### «Галоўная задача — каб урадлівасць глебы павышалася»

Разгляд праблем пачалі з Оршы. Імпульс для развіцця рэгіён атрымаў у канцы 2018 года, калі Прэзідэнтам быў падпісаны Указ № 506 «Аб развіцці Аршанскага раёна» з мэтай павысіць узровень і якасць жыцця людзей. Таксама беларускі лідар нагадаў, што ў дачыненні да Аршанскага раёна была прынята пяцігадовая праграма паскоранага развіцця, якая ахапіла практычна ўсе кірункі вытворчасці і сацыяльнай сферы. «Праект паказальны. Выкарыстоўвалі праграмна-мэтавы метад. Вызначылі элементы інтэгравання. Усе рэсурсы былі выдзелены. Канкрэтна ў АПК Аршанскага раёна ўклалі звыш мільярда рублёў. Раён крыху прыўзнялі. Павялічылі заробкі людзей. Замарудзіўся адток кадраў», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. Разам, з тым, нягледзячы на тое, што многае зроблена, не ўсе мерапрыемствы выкананы, заўважыў беларускі лідар. «Шраг вытворчых і фінансавых паказчыкаў не дасягнуты. Таму губернатару і старшыні Аршанскага райвыканкама я раіў бы сур'ёзна з гэтым разабрацца. Спытаем вельмі сур'ёзна, — папярэдзіў ён. — Не ўдалося выйсці на параметры па збожжавых і лёне. Засталіся недазагружаныя сыравінай новыя магутнасці па перапрацоўцы. Шэраг ферм да гэтага часу не запоўнены жывёлай. Думаю, вам давядзецца сур'ёзна папрацаваць, каб давесці гэтую праграму да лагічнага завяршэння».

Што датычыцца Шклоўскага раёна, то там таксама ідуць інтэграцыйныя працэсы. У раёне 10 гаспадарак, з іх самыя буйныя — холдынг «Купалаўскае» і прадпрыемствы холдынга Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта «Александрыйскае» і «ААБ-Агра Гарадзец».

«Ведаю, што кантралёраў і інспектараў тут было шмат, але сістэмныя праблемы амаль не зрушыліся з мёртвай кропкі, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Калі параўноўваць з мінулым годам, у 2024-м вы злёгку падраслі па валавой прадукцыі малака і буйной рагатай жывёле. Нарыхтавалі больш сенажу і травяных кармоў. Але гэта на паперы. Сянаж і вашы травяныя кармы трэба будзе яшчэ паглядзець па якасці, з-за чаго ў вас дохнуць цяляты, пра гэта навукоўцы і спецыялісты дакладваюць», — заявіў беларускі лідар. Разам з тым ён заўважыў, што падзеж скота ва ўсіх гаспадарках холдынга вырас практычна ў два разы. Вялікая праблема з кадрамі, не хапае ветэрынарных спецыялістаў. Растуць даўгі. «Пасля першага этапу, які мы намецілі, выйсці на прыбытковую працу пакуль так і не ўдалося. А база там створана прыстойная», — заўважыў Прэзідэнт.

Што да ААТ «Александрыйскае», то ў яго ўкладзены немалыя рэсурсы, падкрэсліў Прэзідэнт, амаль 40 мільёнаў рублёў — на пагашэнне інвестыцыйных крэдытаў, закупку збожжа, угнаенняў і іншыя мэты. А праблемы практычна тыя ж, што і ў «Купалаўскага»: зніжэнне пагалоўя птушкі, скарачэнне вытворчасці яек, рост падзяжу буйной рагатай жывёлы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што праязджаючы на машыне па Шклоўскім раёне, быў здзіўлены ідэальнай апрацоўкай глебы на палях. «Люба-дорага паглядзець. Гэта сведчыць аб тым, што ў нас не зжыта з савецкіх часоў прыдарожная тэхналогія: Прэзідэнт будзе ехаць — «вылізалі», — іранічна заўважыў кіраўнік дзяржавы. А ў той жа час, калі глядзець з верталёта ўглыб тэрыторыі, сітуацыя зусім іншая. Некаторыя палі нават не ўзараныя. Прэзідэнт задаў лагічнае пытанне: навошта гераічна займацца меліярацыяй, калі меліяраваныя землі не апрацоўваюцца?

«Наша галоўная задача, райвыканкамаў і аблвыканкамаў — каб усе землі былі ўзараны, каб кожны год урадлівасць глебы павышалася, каб дарогі былі ў парадку і гэтак далей», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў пра сваё даручэнне: кіраўніцтву спраў сумесна з навукоўцамі выпрацаваць выразную і зразумелую канцэпцыю, як далей будзе развівацца «Александрыйскае». Жалезнае патрабаванне — гэта павінен быць канкрэтны, а галоўнае — рэалістычны план мерапрыемстваў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што вынік будзе толькі, калі людзі самі хочуць працаваць у сельскай гаспадарцы. Асабліва, калі гаворка ідзе пра такія гаспадаркі, як «Александрыйскае». Паводле яго слоў, многія гаспадаркі мараць аб такой базе і аб такіх умовах.

Прэзідэнт паставіў перад старшынямі райвыканкамаў і аблвыканкамаў задачу — арганізаваць жалезную, нават ваенную дысцыпліну, калі ўсё, што гаворыць кіраўнік, выконваецца неадкладна. У Шклоўскім раёне цяпер за гэта адказвае Сяргей Барташ. Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чаму з пасады міністра перавёў яго на пасаду старшыні райвыканкама. Аляксандр Лукашэнка ахарактарызаваў Сяргея Барташа як моцнага кіраўніка, пры якім «дурніца» не пройдзе. «Ён вам тут спакойнага жыцця не дасць, таму што ёсць вопыт і веды — ад кіраўніка да міністра», — звярнуў увагу Прэзідэнт. «Ты — зямны чалавек. Вельмі чакаю ад цябе тут выніку. Будзе аказана ўсялякая падтрымка», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### Рабіць трэба з розумам

На нараду спецыяльна былі запрошаны ўсе кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў Аршанскага і Шклоўскага раёнаў. Па словах кіраўніка дзяржавы, неабходна падрабязным чынам абгаварыць дэталі і прыняць канчатковыя рашэнні.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што цяпер для таго, каб атрымліваць прыбытак ад сельскай гаспадаркі, мала карыстацца тым, што дае зямля — патрэбны тэхналогіі. «Мы ўжо вычарпалі тое, што ляжала на паверхні, прыносячы восем мільярдаў экспарту. Гэта вялікія грошы, ніводная галіна столькі не дае. Гэта ўсё вычарпалі. Трэба тэхналогіямі займацца. А тэхналагічная і выканальніцкая дысцыпліна — гэта галоўнае. Не будзе гэтага — няма чаго займацца і ўкладваць грошы», — канстатаваў Прэзідэнт. Ён папярэдзіў, што перш чым звярнуцца па грошы, сельгасарганізацыі павінны даказаць, што гэтыя грошы дадуць эфект.

Аляксандр Лукашэнка таксама акрэсліў некалькі крокаў, якія трэба зрабіць.

**Першае.** Інтэграцыю сельгасвытворцаў трэба працягваць, ствараючы буйныя кампаніі з поўным цыклам вытворчасці. «Там, дзе гэта трэба», — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. Паводле яго слоў, калі невялікія гаспадаркі працуюць добра, то няхай працуюць самастойна. І не трэба такія гаспадаркі губіць далучэннем да іх адсталай гаспадаркі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што з кожным выпадкам трэба разбірацца асобна на месцах. «Штучна нічога рабіць не трэба», — заявіў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што з інтэграцыяй трэба быць акуратнымі і падыходзіць да ўсяго з розумам, без фанатызму, улічваючы вопыт мінулага і перспектыву на будучыню.

**Другое.** Узбуйненне павінна адбывацца на базе моцных гаспадарак з выразнай і зразумелай спецыялізацыяй, каб быў прыклад.

**Трэцяе.** Пераўтварэнні трэба ўкараняць пры строгім выкананні ўсіх тэхналогій, прапрацаванай да драбнюткіх дэталяў сыравіннай базе і строгай дысцыпліне.

«Таму за вынік будуць адказваць не толькі старшыні райвыканкамаў і губернатары. За кожным мерапрыемствам, арганізацыяй, полем, фермай і іншымі аб'ектамі праграмы павінны быць замацаваны канкрэтныя службовыя асобы выканкамаў, міністэрстваў, урада, Адміністрацыі Прэзідэнта, Кіраўніцтва спраў і Акадэміі навук», — папярэдзіў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што многім кабінетным работнікам варта ехаць працаваць у гаспадаркі, на зямлі выкарыстоўваючы досвед і веды. Тады і кадравая праблема будзе вырашана, і эфект ад работы сельгаспрадпрыемстваў будзе большы.

### Інтэграцыя гаспадарак — гэта не панацэя

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка далажыў аб сітуацыі ў Шклоўскім раёне і расказаў, якія меры трэба прыняць для эфектыўнага развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці ў раёне. Сярод іх — павелічэнне долі азімага кліну, колькасці ўзараных зямель, аптымізацыя забеспячэння травянымі кармамі і культывацыя высокабялковых культур. Анатоль Ісачанка таксама адзначыў, што Шклоўскаму раёну неабходна будаўніцтва сіласна-сянажных траншэй, малочнатаварных комплексаў, у прынцыпе, у вобласці хапае. І як зазначыў старшыня аблвыканкама, новыя будаваць няма неабходнасці, трэба займацца тымі, што ёсць. Для таго каб забяспечыць дойны статак камбікармамі, трэба запусціць камбікормавы завод.

Анатоль Ісачанка таксама зазначыў, што ў Слаўгарадскім, Кіраўскім раёнах Магілёўскай вобласці ёсць станоўчыя прыклады інтэграцыйных структур і прапанаваў падобным чынам дзейнічаць і ў Шклоўскім раёне.

Аднак Прэзідэнт звярнуў увагу, што аб'ядноўваць гаспадаркі дзеля аб'яднання не трэба, гэта не панацэя. Паводле яго слоў, у выніку аб'яднання павінен быць фінансавы станоўчы эфект. «Трэба вельмі акуратна падыходзіць і пераконваць людзей. Не павінна быць навязвання зверху», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што Шклоўскі раён павінен паказваць усім астатнім раёнам прыклад развіцця сельскай гаспадаркі. Пры гэтым асаблівае даручэнне губернатару — не забывацца і пра іншыя раёны вобласці.

Прэзідэнт асобна спытаў у Сяргея Барташа, у чым ён бачыць развіццё Шклоўскага раёна. «Нам для таго каб эфектыўна працаваць, трэба вырабіць прадукцыі не менш як на 400 мільёнаў. Дзеля гэтага ёсць усё. І калі аналізаваць папярэдніх паказчыкі вытворчасці — мы іх дасягалі», — адказаў старшыня райвыканкама. Ён таксама звярнуў увагу на неабходнасць работы з кадрамі, тэхналогіямі. Сяргей Барташ назваў яшчэ адну праблему — недахоп жылля. Паводле яго слоў, каб выключыць адток кадраў, жыллё трэба будаваць менавіта ў Шклове.

### «Усё эвалюцыйна ідзе. Ніякіх рэзкіх рухаў не робім»

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін далажыў, што ў Аршанскім раёне працуе 12 сельгасарганізацый і кардынальных рэформ не плануецца. Цяпер развіваюцца створаныя раней інтэграцыйныя структуры. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што стварэнне такіх структур было правільным рашэннем.

«Усё ад жыцця, усё эвалюцыйна ідзе. Ніякіх рэзкіх рухаў ужо не робім», — падкрэсліў Аляксандр Субоцін. Ён таксама адзначыў, што ў Аршанскім раёне ўжо вызначана структура пасяўных плошчаў. Прэзідэнт параіў акуратна павялічваць клін, напрыклад азімых. Аляксандр Субоцін запэўніў, што аграрыі Віцебскай вобласці менавіта такога падыходу і прытрымліваюцца.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў Аршанскім раёне ў першую чаргу трэба навесці парадак у тых гаспадарках, што ўжо ёсць. Пакуль будуць будавацца новыя малочнатаварныя комплексы, трэба давесці да ладу невялікія фермы, дзе сёння ўтрымліваецца жывёла і будзе знаходзіцца, пакуль не адкрыюцца комплексы.

Асобнае пытанне ад Прэзідэнта — сітуацыя на Аршанскім мясакансервавым камбінаце, у мадэрнізацыю якога было ўкладзена немала сродкаў. На прадпрыемстве выпускаюць і дзіцячае харчаванне. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што на гэту прадукцыю ёсць вялікі попыт, у тым ліку з іншых краін. Напрыклад, у дзіцячым харчаванні з Беларусі вельмі зацікаўлены ў Зімбабвэ. Генеральны дырэктар Аршанскага мясакансер-